7. Keupp, J. Die Wahl des Gewandes. Mode, Macht und Möglichkeitssinn in Gesellschaft und Politik des Mittelalters / J. Keupp // Mittelalter-Forschungen. Bd. 33. – Stuttgart: Thorbecke, 2010. – 341 S.
8. Kleiderordnung [Электронный ресурс // Kleiderordnung - Mittelalter Lexikon
9. Режим доступа: http://u01151612502.user.hosting-agency.de/malexwiki/index.php/Kleiderordnung./ – Дата доступа: 17.09.2016.
10. Kleiderordnungen [Электронный ресурс] // Verein Wienische Hantwërcliute 1350. – Режим доступа: http://wh1350.at/de/alltag-um-1350/kleiderordnungen-des-spatmittelalters-in-wien./ – Дата доступа: 17.01.2017.
11. Nowak, T. Die Regensburger Kleiderordnung von 1485 [Электронный ресурс] / T. Nowak // Reinis private Forschungen zur Geschichte Regensburgs. – Режим доступа: http://reinis-welten.de/regensburg/historischeereignisseinregensburg/dieregensburgerkleiderordnungvon1485/index.html/. – Дата доступа: 04.01.2017.
12. 11.Reininghaus, W. Die Straßburger "Knechteordnung" von 1436. Ihre Entstehung und ihre Bedeutung für die Geschichte der Gesellengilden am Oberrhein / W. Reininghaus // Zeitschrift für die Geschichte des Oberrheins 126. Jahrgang / Hrsg. Von Kommission für geschichtliche Landeskunde in Baden-Württemberg. – Band. (Der neuen Folge 87 Band). – ZGORh 126 (NF 87). – Stuttgart: W. Kohlhammer Verlag, 1978. – 1. Auflage. – S. 131–143.
13. Schulze, W. Gerhard Oestreichs Begriff "Sozialdisziplinierung in der frühen Neuzeit" / W. Schulze // Zeitschrift für Historische Forschung. 1987. – Bd. 14. –S. 265–302.
14. 13.Vollbach, F. E. Von Kleiderordnungen und Dress-Codes [Электронный ресурс] / F. E. Vollbach // Sachsen-Lese. – Режим доступа: http://www.sachsen-lese.de/index.php?article_id=277/. – Дата доступа: 17.01.2017.

**Доўнар А.Б.**

## З ГІСТОРЫІ ПАЎСЯДЗЁННАСЦІ. МАЁМАСНЫ СТАН ВІЦЕБСКІХ КОННЫХ МЯШЧАН У КАНЦЫ XVI ст.

У гістарыяграфіі добра вядомы факт падзела віцебскіх мяшчан на паспалітых і конных (пасельскіх) [3; 4, с. 527–528; 5, с. 100–108, 120, 124; 8, с. 92]. Добра вядомы і факт таго, што юрыдычна гэты падзел перастаў існаваць пасля надання Віцебску магдэбургскага права і аб'яднання дадзеных сацыяльных груп у адну мяшчанскую абшчыну. Магдэбургскае права Віцебск атрымаў 17 сакавіка 1597 г. [1, с. 165–170; 2, с. 74–82; 5, с. 108, 192–199; 6, арк. 218 адв. – 224 адв.]. Разам з тым трэба прызнаць, што ў адно імгненне сацыяльныя группы не знікаюць. У гэтым сэнсе цікавасць уяўляе дэкрэт, які быў выдадзены ў задворным асэсарскім судзе ВКЛ 7 красавіка 1600 г.

Справа была ў наступным. 18 лістапада 1597 г. слугі віцебскага гараднічага Станіслава Валянцінавіча Каменскага ноччу «гвалтоўна» напалі на маёнткі Жарскі і Матшыніцкі віцебскіх мяшчан Радкі Паўлавіча, Стэфана і Івана Арцёмавічаў Жарскіх і Гапона Грыгоравіча Матшыніцкага. У час напада мяшчане і іх сем'і, прыслуга былі збіты, а яны і іх рэчы былі забраны нападаючымі і адвезены ў маёнтак Каменскага Палогі. Мяшчане былі пасажаны Каменскім у вязенне ў турму, якіх ён «в ланцугах оковах держал», пры чым адзін з мяшчан, Улас Іванавіч Матшыніцкі, дзядзька Гапона, ад пабояў памёр [7, арк. 98–106 адв.].

Напад быў ажыццёўлены пасля атрымання Віцебскам магдэбургскага права, разам з тым пра гэты факт у справе не згадваецца (толькі пры вызначэнні памеру галаўшчызны ў 30 коп гр. за забітага суд кіраваўся палажэннем Статута ВКЛ (арт. 6 раздз. 12) адносна мяшчан магдэбургскага права [7, арк. 106]). Разам з тым, вышэйзгаданыя віцебскія мяшчане характарызуюцца як «мещане нашы (*гаспадарскія – А.Д.*) места упрывелеяванага Витебского» і іх сацыяльны статус як «конныя» нідзе не акрэслены. Але, што гэта былі менавіта яны, сумленняў не ўзнікае (гаворачы больш дакладна – гэта былі былыя конныя мяшчане), бо яны валодалі маёнткамі па-за межамі горада. Відаць судовы дэкрэт не называе іх коннымі менавіта з-за ўвядзення магдэбургскага права ў Віцебску, якое, як адзначалася вышэй, аб'яднала конных і паспалітых у адну мяшчанскую абшчыну, члены якой мелі аднолькавыя правы і абавязкі). Гэты факт сведчыць менавіта пра тое, што як асобная сацыяльная група конныя мяшчане перасталі існаваць пасля 1597 г. Важнай з'яўляецца характарыстыка ў дакуменце маёнткаў мяшчан як «ымена их власные здавна отчызные и дедизные … в воеводстве Витебским под правом места Витебского лежачые» [7, арк. 98 адв.], якая сведчыць пра тое, што землі былых конных мяшчан па-за межамі горада – «пасельскія» – пасля ўвядзення магдэбургскага права засталіся «под правом места Витебского», г.зн. на іх распаўсюджвалася магдэбургскае права.

Пасля нападу, віцебскія мяшчане 20 лістапада 1597 г. звярнуліся ў гродскі суд Віцебскага ваяводства з скаргай аб «наездзе» і прадставілі пасведчанні вознага Віцебскага ваяводства Юрыя Захарчынскага аб аглядзе «ран и знаков бою на Радку Жарском а на небощику Власе Ивановичу». Мяшчанам былі выдадзены з гродскага суда выпісы аб іх скаргах і пасведчаннях вознага аб пабоях, як і возным быў складзены рэестр шкод мяшчан. Дадзены факт выклікае цікавасць: чаму віцебскія мяшчане звярнуліся менавіта ў гродскі суд і чаму нідзе не згадваецца

Рэпазіторый ВГУ

магдэбургскі суд і магдэбургскія ўраднікі? Гэта магло адбыцца па розных прычынах: віцебскія мяшчане маглі дзейнічаць па старыне, не засвоіўшы добра новых парадкаў, ці, хутчэй, магдэбургскае права яшчэ толькі ўводзілася, як і нельга выключаць магчымасць, што пасельскія маёнткі віцебскіх мяшчан нейкім чынам заставаліся пад пэўным кантролем гродскага суда.

Як развіваліся падзеі з канца 1597 г. да пачатку 1600 г., на жаль, мы не ведаем – толькі згадваецца, што С. Каменскі тыя маёнткі віцебскіх мяшчан «отнял и на себе держа» [7, арк. 98 адв.]. 7 красавіка 1600 г. задворны суд ВКЛ пад старшынствам канцлера ВКЛ Льва Сапегі прыняў дэкрэт на карысць віцебскіх мяшчан: прысудзіў ім тыя маёнткі «яко властности их вечне» і наклаў штраф на С. Каменскага ў двайным памеры шкод: за шкоды яму трэба было аддаць Жарскім 1681 капы
16 грошаў і 4 пенязі, а Матшыніцкім – 2467 кап 5 грошаў і 8 пенязяў [7, арк. 106–106 адв.]. Станоўчаму рашэнню справы паспрыяла добрая падрыхтаванасць віцебскіх мяшчан да судовага пасяджэння, яны не толькі нанялі вопытнага юрыста – дворнага каралеўскага енерала Вайцеха Малінскага, але і прадставілі суду манаршыя прывілеі гораду Віцебску ад 21 лютага 1547 г і 18 лістапада 1570 г., згодна з якімі «водлуг прывилеев» Казіміра і Жыгімонта Старога «вси добра лежачие всего места Витебского купленые и яким кольвек правом набытые, ствердивши, вароватн рачыли» і занатавалі норму, згодна з якой нават манархі «никому жадным правом никоторых добр от места Витебского раздавати» не маглі. Акрамя гэтага мяшчане даказвалі свае правы на вышэйзгаданыя землі асобістыя манаршымі прывілеямі і судовымі дэкрэтамі другой паловы XVI ст. [7, арк. 104 адв. – 105].

У дэкрэце суда 1600 г. прыведзены рэестр шкод віцебскіх мяшчан, які заняў больш за 10 старонак і які дае ўяўленне пра пэўныя моманты штодзеннагажыцця конных мяшчан Віцебска канца XVI ст. (пры гэтым трэба улічваць, што рэестр шкод зафіксаваў не ўсю маёмасць мяшчан, а толькі забраную). Па рэестры шкод, можна аднавіць з высокай ступенню верагоднасці асартымент адзення, бялізны, упрыгожванняў, кола заняткаў, прылад працы, посуду, рацыёна харчавання былых конных мяшчан Віцебска.

Найперш, можна сцвярджаць, што віцебскія конныя мяшчане жылі ў сваіх «пасельскіх» маёнтках, г.зн. па-за межамі Віцебска (як і не выключана магчымасць уладання даннай групай насельніцтва нерухомай маёмасцю і на тэрыторыі непасрэдна горада). Маёнтак коннага мешчаніна ўяўляў цэлы гаспадарчы комплекс з жылых дамоў і гаспадарчых пабудоў і зямель, якімі яны валодалі на праве прыватнай уласнасці. У іх маёнтках згаданы «людзі», відаць, залежныя сяляне і іх чэлядзь. Мяшчане ў маёнтках пражывалі вялікімі семьямі. Так, у доме Радькі Жарскага жылі яго жонка, сын Арэшка і нявестка. Асабістыя рэчы сахоўваліся у сундуках, скрынях. Пры чым кожны член сям'і меў свае асабістыя рэчы і грашовыя сродкі. Так, ў Радкі Жарскага было забрана 80, у яго жонкі – 30, у яго сына Арэшкі – 60, нявесткі – 10; у Івана Жарскага – 30; у Гапона Матшыніцкага – 100, у яго жонкі Ганны Сямёнаўны – 30, у яго сына Цімафея – 50, у яго дзядзькі Уласа 50 коп гр. [7, арк. 99, 99 адв., 102].

Асноўнай павіннасцю віцебскіх конных мяшчан была конная ваенная служба, у сувязі з чым сярод маёмасці згадваецца коні паштовыя, узбраенне, даспехі (гл. табл.).

Віцебскія мяшчане вялі разгалінаваную гаспадарку. Яны займаліся:

- земляробствам (вырошчвалі зерневыя культуры (жыта, ярыцу, пшаніцу, ячмень, авёс, грэчку, гарох, лён канаплю, мак) і агародніну (агуркі, цыбулю, капусту, буракі, рэпу);
- жывёлагадоўляй (вырошчвалі буйны рагаты скот, свіней, авечак), птушкагадоўляй (вырошчвалі гусей, качак, курэй);
- ляснымі промысламі: пчалярствам, паляваннем (гл табл.), выпальвалі попел [7, арк. 101 адв., 103];
- гандлем (пра што сведчыць наяўнасць сярод іх маёмасці вялікай колькасці солі, попелу, які прадназначаўся на продаж).

Магчыма, мяшчане займаліся рамяством. Так, у іх маёмасці згадваюцца 2 сверлы «вялікія» па 6 гр. [7, арк. 102].

Вымалачанае зерне захоўвалася ў бочках, як зерне захоўвалася і ў невымалчаным стане, так згадана, што у Жарскіх было забрана 2 «переплоти у возероды» ячменя у якіх было 8 коп ячменя (па 10 гр. капа). Сена ж захоўвалі ў пунях і «стирдах» [7, арк. 101 адв.].

Репозиторий ВГУ

**Табліца. Спіс маёмсці, якая была забрана слугамі С. Каменскага 18 лістапада 1597 г. у віцебскіх мяшчан**

| | *Жарскіх* | кошт | *Матшыніцкіх* | кошт |
|---|---|---|---|---|
| *коні* [7, арк. 99, 102, 103 адв.] | | | | |
| конь пачтовы | «шэрстью» рыжы | 16 коп гр | «шэрстью полового» | 15 коп гр |
| | «шэрстью голубый» | 8 коп гр | коней «пашных» – 2 | 6 коп гр |
| коні рабочыя | 4 | па 4 коп гр | коней «пашных» – 4 | 5 коп гр |
| *ваенны рыштунак* [7, арк. 99, 102 адв.] | | | | |
| бехцер | 1 | 6 коп гр | 1 | 12 коп гр |
| панцыр | 1 | 4 коп гр | «кольчаныя» – 2 | па 4 коп гр |
| прылбіцы | 2 | па 3 зл | 3 | па 3 зл |
| пулгак | 1 | 1, 5 коп гр | парахаўніц – 8, у якіх было пораху 3 фунты | за ўсё 2 копы гр |
| ручніц «зверыных» | 2 | па 1 капе гр | 4 | па 1 капе гр |
| ручніц «пташых» | 3 | па 2 зл | 4 | па 70 гр |
| сагайдак з лукамі і стрэламі | 2 | па 3 зл | 2 | па 3 зл |
| Шабля | 1 | 3 зл | 7 | 3 зл |
| | 1 | 2 зл | | |
| Корд | 1 | 28 гр | 2 | 28 гр |
| ашчэпаў «звырыных» | 5 | па 15 гр | | |
| ашчэпаў «защытных» – 2» | 2 | па 12 гр | | |
| «сякерка падарожная» | | 8 гр | | |
| сядло «дзямід» | | | 1 | за 1,5 коп гр, |
| сядло | | | 1 | 30 гр |
| | | | 1 | 16 гр |
| «войлакі» | | | 3 | па 18 гр |
| «рид» казацкі | | | 1 | 70 гр |
| узды простыя | | | 3 | па 4гр |
| хамуты «ременные» | | | 3 | па 1 зл |
| хамуты «до сох ку оранню» | | | 6 | па 12 гр |
| *прадукты харчавання* [7, арк. 100 адв., 101, 101 адв., 102, 103, 103 адв., 104] | | | | |
| жыта, бочак | 120+40* | па 24 гр | 250 | па 24 гр |
| пшаніцы, бочак | 40+30 | па 40 гр | 80 | па 40 гр |
| ячменя, бочак | 102+16 | па 20 гр | 200 | па 20 гр |
| грэчкі, бочак | 20 | па 20 гр | | |
| ярыцы (яравога жыта), бочак | 60+13 | па 20 гр | | |
| аўса, бочак | 202 | па 16 гр | | |
| гарох, бочак | 1,5 + 3 | па 20 гр | | |
| семя канаплі, бочак | 2+1,5 | па 30 гр | | |
| семя мака, бочак | 1 + 1 | 50 гр | | |
| семя льна, бочак | 1,5 | за 1 капу гр | | |
| «плоскони неметое» | 2 беркавескі | за 6 коп гр | | |
| мука пшанічная | | | 2 бочкі | па 40 гр |
| мука «аржаное» | | | 5 бочак | па 24 гр |
| крупы «ячныя», бочак | 0,5 | 10 гр | 1 | 20 гр |
| крупы грэчневай, бочак | 0,5 | 8 гр | 1 | 20 гр |
| крупы аўсяныя, бочак | 0,5 | 8 гр | 1 | 16 гр |
| агуркі салёныя, бочак | 1 | па 20 гр | 1,5 | па 20 гр |
| цыбуля салёная, бочак | 1+1 | па 20 гр | цыбуля – 2 бочкі | па 20 гр |
| цыбуля «сухая», бочак | 1+1 | па 20 гр | | |
| капуста – 3 кадзі | | па 6 гр | | |
| капуста салёная | 2 кадзі | за 20 гр | | |
| капуста «крышоное» | 1 кадзь | за 20 гр | | |
| капуста «кислое» | 1 вялікая кадзь | за 20 гр | | |
| буракі («свекла») – 2 вялікія каді | | за 12 гр | | |
| рэпы | 10 бочак | па 6 гр | | |
| сала свіннога | 4+4 шт | па 15 гр | 5 шт | па 15 гр |
| свініны | 6 «полтей» | па 20 гр | | |
| калбас свінных | 60+50 | дзесятак па 2 гр | мяса – 8 «полтев» | па 20 гр |
| кумпякоў | 16 | па 2 гр | | |
| гусей «бітых» | 10 | па 2 гр | | |
| качак «бітых» | 15 | па 1, 5 гр | | |
| масла | 1,5 пуды = 1 мядніца | мядніца па капе гр | 3 пуды = 3 мядніцы | мядніца па капе гр |
| сыры | 42 | па 8 пенязей | 90 | па 8 пенязей |



Рэпазіторый ВДУ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| мёду прэснага | 10 пудоў = 6 мядніц | мядніца па капе гр | 20 пудоў= 10 мядніц | мядніца па капе гр |
| солад | | | 23 бочак, што =20 бочак ячменю | |
| соль, пуды | 11 | 64 гр | 3 | 30 гр |
| соль, беркавескі | | | 12 | Па 3 капы гр |
| *спіс хатняй жывёлы і птушак* [7, арк. 100 адв. – 101, 102, 103 ] | | | | |
| кароў дойных | 6+4 | па 100 гр | 12 | па 100 гр |
| падцёлкаў | 5+3 | па 30 гр | | |
| быкі | 3 (за 2 капы гр)+2за 2 капы гр | | | |
| цялят гадавых | 4 | па 20 гр | 9 | па 20 гр |
| авечак старых | 11+9 | па 15 гр | 18 | па 15 гр |
| авечак маладых | 15+16 | па 6 гр | | |
| свіней «кормных» | 5+19 | па 20 гр | свіней «кормных вепров» – 5 | па 1 капе гр |
| свіней «надворных» | 9 | па 20 гр | 25 | па 20 гр |
| падсвінкаў | 15 | па 15 гр | | |
| Гусей | 10+11 | па 3 гр | 20 | па 3 гр |
| Качак | 30+12 | па 2 гр | 60 | па 2 гр |
| Курэй | 90+40 | па 3 гр | 100 | па 3 гр |
| Пчол | | | 70 вулляў | па 5 коп гр |
| *спіс посуду, кухоннага начыння* [7, арк. 99 адв., 103, 103 адв.] | | | | |
| скаварада | 2 | за 30 гр | | |
| чапяла жалезная | 1 | | | |
| качарга жалезная «спольная» | 1 | 0,5 зл | | |
| скаварада | 1 | 15 гр | | |
| «мис драўляных» | | | 5 | за 30 гр |
| талерак | | | 10 | |
| лыжак «московских» драўляных | | | 20 | |
| «ражок» | | | 6 | |
| дзяжа | | | 2 | |
| «ночвы» | | | 4 | |
| «рошот» | | | 4 | |
| сіта | | | 2 | |
| талерак металічных («цыновых») | | | 10 | за 50 гр |
| «мис» металічных | | | 5 | за 1,5 капы гр |
| лыжкі металічныя | | | 20 | за 30 гр |
| «конвей» металічны | | | 1 | 70 гр |
| «флеш» металічная | | | 1 | 1 капа гр |
| «шкляніц» вялікіх і малых | | | 4 | 20 гр |
| *прылады працы і інш.* [7, арк. 99 адв.,102 адв., 103] | | | | |
| тапары | «домовые»– 6 | па 12 гр | 8 | па 12 гр |
| сох | 4 | па 15 гр | 4 | па 15 гр |
| «секиры» | 4 | па 4 гр | | |
| жорны ручныя | 3+2 | па 1 зл | 1 | 30гр |
| жорны «млыновы зо всяким начынем железным» | | | 1 | 7 коп гр |
| косы | 5 | па 9 гр | 5 | па 6 гр |
| сярпы | 8 | па 12 пенязей | 12 | па 12 пенязей |
| «сечка» | 1 | 4 гр | 2 | за 8 гр |
| кацёл піўны вялікі | 1 | 8 коп гр | | |
| трубы «медныя винные» | | 1,5 капы гр | | |
| чоп піўны вялікі | 1 | 40 гр | | |
| чоп малы | 1 | 15 гр | | |
| кадзі піўныя | 2 | па 15 гр | | |
| бочкі піўныя | 4 | 12 гр | | |
| кацёл «настольный» | 1 | 3 зл | | |
| кацёл меншы | 1 | 1 зл | | |

* – «+» азначае, што згаданая маёмасць была забрана ў розных прадстаўнікоў рода Жарскіх

Многія рэчы мяшчане куплялі, а некаторыя рабілі самі: у першую чаргу ткалі матэрыю і выраблялі для гэтага сыравіну. Так, у мяшчан Жарскіх было забрана нячосанага льну 40 «пяткоў (менш чым за 40 гр)» і чосанага льну «кужелю 15 паятков « (за 50 гр), воўны «на

Репозиторий ВГУ

пражу суконную неготованую рук 26» (за 40 гр.) і адзін беркавеск «пеньки трепаное» (за 3 капы гр.) [7, арк. 101 адв.]

Мяшчане мелі багатае адзенне, упрыгожванні. Так, у іх гардэробе меліся святочная шуба «крытая» англійскім» чорным суктом з бабровым каўнерам (за 8 коп гр.), ласіны жупан з сярэбрынымі аплікацыямі (3 капы гр.), сіні сукман (2 капы гр.), жаночая шуба падшытая кролікамі (2 капы 30 гр.), жупаны чырвоныя (2 капы гр.), ярмакі сінія (3 капы гр.), сермягі белыя (па 20 гр.) і г.д., а ў жонкі Радкі Жарскага мелася «брамка перловая» (6 коп гр.), звязка з 12 сярэбраных пазалачоных пярсценкаў (4 капы гр.) і «чепец золотый» (2 капы і 20 гр.), а ў яе нявесткі – 5 пазалачоных пярсцёнкаў (па 12 гр.), «ланцужок сребрый с крыжиком позлотистым» (весам у 4 талеры). Акрамя згадваюцца дарагія шубы лісіныя (за 12 і 14 коп гр.), кажухі баранні з бабровымі каўнерамі, кажушкі з белак, шапкі аксамітавыя, шапкі падшытая куніцамі, кужэльныя кашулі, вышываныя чапцы, хусткі белыя, мужскія боты (за 15 гр.) і г.д. [7, арк. 99, 99 адв., 100, 102]. Сярод бялізны згадваецца «простицы» сінія (за 40, 20, 15 гр, за 3 зл.), рушнікі вышываныя чырвоным шоўкам (1 зл.), простыя рушнікі (па 6 гр.), банныя рушнікі (за 4 гр.), вялікія абрусы (за 16 зл.), абрусы вялікія і малыя (за 24 гр.) і інш. [7, арк. 99 адв., 100]

Такім чынам, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што згаданыя віцебскія мяшчане прадстаўлялі зажытачную частку мяшчанства. Добра ведалі і карысталіся існуючымі прававымі традыцыямі. Вялі самастойна разгалінаваную зажытачную гаспадарку і мелі багатую маёмасць.


1. Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией : [в 5 т.]. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1846– 1853. – Т. 4 : 1588 – 1632. – 1851. – VIII, 529, [46] с.
2. Витебская старина : [в 5 т.] / сост. и изд. А. Сапунов. – Витебск : Тип. Губерн. правления, 1883–1888. – Т. 1. – 1883. – XXII, 664 с., [20] л. ил.
3. Лаппо, И. И. К истории сословного строя великого княжества Литовского. Конные мещане Витебские в XVI столетии / И. И. Лаппо // Сборник статей посвященных В.О. Ключевскому. – М. 1909. – С. 254–276.
4. Любавский, М. К. Областное деление и местное управление Литовско–Русского государства ко времени издания первого литовского статута : ист. очерки [с карт. Литов.–Рус. государства в конце XV и начале XVI в.] / М. К. Любавский. – М. : Унив. тип., 1892. – [998] с., разд. паг., 1 л. карт.
5. Макараў, М. Дз. Ад пасада да магдэбургіі: прававое становішча насельніцтва местаў Беларускага Падзвіння ў XIV–XVII ст. / М. Дз. Макараў. – Мінск : Экаперспектыва, 2008. – 248 с.
6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Далей – НГАБ). – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 83.
7. НГАБ. – КМФ-18. Воп. 1. Спр. 288.
8. Пашуто, В. Т. Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства / В. Т. Пашуто, Б. Н. Флоря, А. Л. Хорошкевич – М. : Наука,1982. – 264 с.



**Агееў А.Р.**


## ВІЦЕБСКАЯ І МАГІЛЁЎСКАЯ РАТУШЫ: ПАДАБЕНСТВА І АДМЕТНАСЦІ ЛЁСАЎ

Запазычанае ў Еўропе магдэбургскае права ў XVI–XVIII стст. мелі практычна ўсе вялікія, сярэднія і значная частка невялікіх беларускіх гарадоў. Яно забяспечвала гарадам развіццё рамяства і гандлю, вызначала месца і стан гараджан у феадальным грамадстве, бараніла мяшчан ад уціску шляхты і велікакняжацкай адміністрацыі, спрыяла саслоўнаму адзінству. Паводле падлікаў А. Доўнара з 1390 па 1762 гг. Магдэбургскім правам у розных яго вырыянтах карысталіся 52 населеных пункты на тэрыторыі сучаснай Беларусі [3].

На ўсходзе Вялікага Княства Літоўскага атрыманне магдэбургскага права адбылося значна пазней за захад Беларусі, што было выклікана не толькі большай удаленасцю ад еўрапейскіх гарадоў, але і існаваннем іншых сістэм кіравання і самакіравання. У канцы XVI – пачатку XVII стст. магдэбургскае самакіраванне стала ўспрымацца, як агульнадзяржаўны эталон гарадскога самакіравання ў ВКЛ. У сувязі с чым многія гарады, якія мелі іншыя схемы самакіравання, сталі дабівацца распаўсюджання дзеяння магдэбургскага кіравання на сваю тэрыторыю: у 1597 г. атрымаў магдэбургскае права Віцебск, у 1620 г. – Орша. На Магілёўшчыне Магдэбургскае права мелі Магілёў (1577), Крычаў (1633), Бялынічы (1634), Мсціслаў (1634), Чавусы (1634), Чэрыкаў (1641), Шклоў (1762, але верагодна раней за Магілёў). Беларускія магдэбургскія гарады стаялі на адной роўніцы са славутымі гарадамі Старога Свету ў сэнсе самакіравання, і гэта стварала вялікія магчымасці для іхняга развіцця і росту.

Ратушы будаваліся пасля надання мяшчанам права самім вырашаць праблемы свайго жыцця і былі матэрыяльнымі маркерамі, якія сведчылі аб самакіраванні гарадоў. У іх размяшчаліся



Рэпазітарый ВГУ